# Калейдаскоп

май 2024

**Школьная газета №9 (59)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову



**Кажуць, мова мая аджывае**
**Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.**
**Для мяне ж яна вечна жывая.**
**Як раса, як сляза, як зара. (П. Панчанка)**

**Не цурайцесь роднай песні**
**Ў шчасці і ў жалобе. (Я. Купала)**

**Ці плачу я, ці пяю,**
**Ці размаўляю з матуляю —**
**Песню сваю, мову сваю**
**Я да грудзей прытульваю. (П. Панчанка)**

**Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. (А. Крывіцкі)**

**Хоць яго з поля, як зелле, высмоктвалі,**
**Не забывалася ў долі нясытае, -**
**Не забывалася ў долі нясытнае, —**
**Намі навечна ў насевак усыпана**
**Роднае слова. (М. Лужанін)**

**Магутнае слова, ты, роднае слова!**
**Са мной ты на яве і ў сне. (Я. Купала)**

**Не забудзьма ж нашчадкам сваім**
**Перадаць у нязменнай красе**
**Наша добрае слова. (А. Вялюгін)**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**май 2024**

## МАЙ



**Сучаснай беларускай літаратурнай назве месяца май адпавядае старажытнабеларуская травень, якая паходзіць ад слова «трава», бо ў гэтым пятым месяцы года зямля пакрываецца зелянінай. Такое найменне захавалася не толькі ў старажытных пісьмовых крыніцах, але і ў вуснай народнай творчасці. Май — адзіная ў нас назва, узятая з лацінскай мовы. Тая ж лацінская аснова таксама ў нямецкай і французскай мовах — Mai, англійскай -Мау, польскай — maj, вянгерскай — majus, рускай — май і інш.**

Рымляне прысвяцілі месяц багіні зямлі Маі. У канцы красавіка і пачатку мая яны адзначалі вясёлае свята Фларэлія ў гонар багіні кветак Флоры. У прыватнасці, у першы дзень апошняга месяца вясны быў звычай садзіць дрэва, што называлі «маем».

**6 мая.** Георгій (Юр’я, Юрай, Ягор’я). З Юр’я, як лічылі амаль паўсюдна, пачынае кукаваць зязюля. На Юр’я сяляне выходзілі з песнямі і ахвярнымі стравамі аглядаць свае зарунелыя палеткі. З Юр’ем звязваўся, як правіла, і першы выпас жывёлы. Дбайны гаспадар не прапускаў без увагі стан надвор’ я і рабіў для сябе пэўныя высновы: «Калі на Ягор’я мароз — будзе добры авёс», «Як на Юр’я пагода, то на грэчку няўрода».

**7 мая.** Сава, Валянцін, Лявонцій, Хама, Лізавета, а таксама Аляксей і Аўсей — імёны гэтых святых як быццам самім сваім гучаннем заклікалі селяніна хоць што-небудзь пасеяць на ніве. Асабліва сугучнае з абавязковай палявой культурай імя апошняга святога зашыфроўвала ў сабе несумненную параду: «Аўсей — авёс сей».

**8 мая.** Марк, Сільвестр. «Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка». «Сей лён на Станіслава, вырасце як лава».

**15 мая.** Дзень Барыса і Глеба — значнае свята ў народзе. Шанаваліся на яго крыніцы, якія не замярзалі і лічыліся гаючымі, асабліва ад хвароб вачэй. «Святы Барыс — коні пасець, прывёўшы дамоў, закладываець…», «барануець, поле раўнуець…», «ячмень сеець з поўнай сявенькі, з правай жменькі, кіне рэдка — дасць Бог густа». Па розных мясцовасцях на Барыса неабходным лічылася сеяць дзе бульбу, дзе бабы, дзе цыбулю.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**май 2024**

**МАЙ**



**22 мая.** Мікола веснавы (ці летні). «Да Міколы няма дабра ніколі» — гаварылі ў народзе, г. зн. няма пэўнасці ў надвор'і, і толькі Мікола «пагоду становіць», таму і зваўся ён яшчэ цёплым. Не забывалася і народная песня пра гэтага шанаванага святога — цудатворца, абразы якога віселі амаль у кожнай хаце: «Мікола — стары сявец, ячмень сеець… з левай ручкі засяваець, кінець рэдка — расцець метка», «і траву расціць, і скот пасціць». Веснавы Мікола лічыўся святам конюхаў. «Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі». Паглядаў селянін і на палеткі: як жыта выплыве перад Міколаю, то будзе добры ўмалот.

**23 мая.** Сымон, Кіпрыян, Анісім, Эразм, Сідар, Таіса, а таксама апостал Зілот. Яго імя выклікала ў чалавека асацыяцыю з золатам. Але адкуль магло прыйсці багацце селяніну, як не з уробленых ім палеткаў? Вось і звязваў ён гэты веснавы дзень з вытокам свайго дабрабыту: «Сей пшаніцу на Зілота — яна будзе, як злота». Часам пад вечар высявалі і каноплі.

**24 мая.** Дзень Кірылы і Мяфода. Па ім меркавалі пра ўсё наступнае лета: калі ён мокры — і лета будзе мокрае, калі сухі — усё лета сухое. Чамусьці гэты дзень называлі «днём абнаўлення Царграда» (ад землятрусу) і аддавалі яму ўвагу асвячэннем палёў з хрэсным ходам, каб градам (сугучнасць з назвай горада абавязвала) не пабіла пасеваў. Асабліва забаранялася на «градаboддзе» араць.

**27 мая.** Максім, Сідар. У гэты дзень былі халодныя вятры: «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сівяры».

**28 мая.** Пахом, Ісай, Дзмітрый. Гэты дзень у адрозненне ад папярэдняга прадугледжваў адваротнае надвор'е: «Пахом павее цяплом». На Пахома амаль усюды дазвалялася ўсё рабіць, але паколькі ён лічыўся галоўным чынам агародным святам, то абавязкова стараліся пасадзіць агуркі: «Пасееш агуркі калі Пахом — будзеш хадзіць з мяхом», г. зн. збярэш шмат агуркоў.

# Юбілейныя даты



## 6 мая 120 год з дня нараджэння Паўлюка Труса



**Паўлюк Трус**
**(1904 -1929)**

**Край легенд,**
**Крыжоў, магіл-курганаў,**
**Край тугі —**
**Бальзам жывых крыніц...**
**Край паэм,**
**Адвечных песенъ-казак —**
**Дарагая сэрцу**
**Беларусь...**

**Паўлюк (Павел Адамавіч) Трус** — адна з самых яскравых постацей беларускай літаратуры. Ён нарадзіўся **6 мая 1904** г. у прыгожым кутку Беларусі — у вёсцы Нізок, што на Уздзеншчыне.

Як прыгадвае сам паэт у аўтабіяграфічных нататках, жылося ў дзяцінстве нялёгка на дзвюх бацькавых дзесяцінах зямлі. Нягледзячы на беднасць і нястачы, бацька вырашыў даць адукацыю свайму старэйшаму сыну і адпусціў яго вучыцца ў Уздзенскую сямігодку. Лёгка апрануты, не заўсёды сытна накормлены, юнак зімой туліўся ў школьным інтэрнаце, а ў цяплейшую пару хадзіў па навуку штодзень пехатою за сем кіламетраў.

## 120 год з дня нараджэння Паўлюка Труса

Вучыўся старанна. Асабліва любіў маляваць, спяваць і сачыняць вершы, некаторыя з якіх запісваў у сшытак. Вельмі падабаўся сябрам, бо быў вясёлы, просты, камунікабельны. У 1923 г. сямігодка была скончана. Малады, няўрымслівы юнак паступае вучыцца ў Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум — сапраўдную кузню нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, настаўніцтва ў даваенны час. Вучыўся паэт добра, старанна. Шмат друкаваўся ў перыёдыцы, меў у сваім актыве паэтычны зборнік з нейтральнай, сціплай назвай — "Вершы" (1925), чакаў выхаду другога, што адбылося ў 1927 г., напрыканцы заканчэння навучальнай установы, — "Ветры буйныя". Другі зборнік быў заўважаны крытыкамі, сябрамі па літаратурным цэху — аб'яднанні "Маладняк", у які паэт быў прыняты ў 1924 г.







Увесну 1927 г. паэт закончыў тэхнікум, атрымаў дыплом настаўніка і быў накіраваны на працу ў Гомельскую вобласць. Праўда, настаўнічаць не давялося — выконваў абавязкі загадчыка аддзела ў абласной газеце "Палеская праўда" (1927—1928). Кіраваў абласной філіяй БелАППа, часта ездзіў па раёнах, выступаў з вершамі, дакладамі. З перапіскі Труса з сябрамі відаць, што ён у Гомелі жыў напружаным духоўным жыццём, наведваў тэатральныя спектаклі, наладжваў літаратурныя справы, клапаціўся пра лёс слоўнага мастацтва на Беларусі.

У 1928 г. Паўлюк Трус быў на сустрэчы выпускнікоў Белпедтэхнікума ў вышытай Марыяй Германовіч кашулі, спяваў у хоры, быў вясёлы, узбуджаны. 26 чэрвеня 1928 г. паэт напісаў заяву аб прыняцці яго студэнтам літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ, з якой можна даведацца, што ён свядома паехаў у Гомельскую вобласць як новадалучаны да Беларусі рэгіён з ярка выражанымі асветніцкімі мэтамі.

# Юбілейныя даты



У 1928 г. Паўлюк Трус быў на сустрэчы выпускнікоў Белпедтэхнікума ў вышытай Марыяй Германовіч кашулі, спяваў у хоры, быў вясёлы, узбуджаны. 26 чэрвеня 1928 г. паэт напісаў заяву аб прыняцці яго студэнтам літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ, з якой можна даведацца, што ён свядома паехаў у Гомельскую вобласць як новадалучаны да Беларусі рэгіён з ярка выражанымі асветніцкімі мэтамі. Ну а вучыцца ва ўніверсітэце ён хацеў таксама свядома, "бо толькі тады той ці іншы пісьменнік зможа даць.што-небудзь каштоўнае для беларускай літаратуры, калі ён будзе чалавекам усебакова асвечаным, чалавекам культурным у шырокім сэнсе гэтага слова". Падобная пазіцыя характарызавала мастака слова, які прызнаваў, што актыўная грамадская праца забірае шмат часу, не дае магчымасці рэалізавацца таленту. Акрамя гэтага, многія лісты Труса поўняцца разуменнем таго, што палітыка і мастацтва — рэчы несумяшчальныя, што літаратурная барацьба не павінна быць розгаласам ці адбіткам партыйнай, ідэалагічнай барацьбы.

У 1928 г. паэт пераязджае з Гомеля ў Мінск.

Зімой 1929 г. паэт жыў на ўскраіне Мінска, у Серабранцы, надта бедна. Ускладніліся адносіны з былымі сябрамі. Апошнія месяцы года працаваў у Беларускім радыёкамітэце супрацоўнікам літаратурнай рэдакцыі. Здаўшы летнюю сесію за першы курс, наведаў малую радзіму, свой незабыўны Нізок і паехаў у камандзіроўку па Магілёўшчыне. Як аказалася, у апошнюю. Вярнуўся ў Мінск у сярэдзіне жніўня з адчуваннем нейкай цяжкай хваробы. Змог сустрэцца.з М. Хведаровічам, П. Глебкам, В. Шашалевічам у Ждановічах пад Мінскам. Стала кепска. Пехатой дабрыў да Мінска, да бальніцы. Там прадставіўся студэнтам. Нікога не турбаваў. Хвароба аказалася запушчанай, невылечнай — тыфус.

30 жніўня 1929 г. Труса не стала. Яму было толькі 25 гадоў. Хаваў яго літаральна ўвесь Мінск. Так абарвалася жыццё светлага таленту, шчырага лірыка.



## 120 год з дня нараджэння Адама Русака



**Адам Герасімавіч Русак (1904-1987) — паэт-песеннік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1939 года.**

Нарадзіўся 24 мая ў вёсцы Пясочнае Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Рана будучы музыкант і паэт акунуўся ў чароўны свет музыкі. Ад прыроды здольны да музыкі, малы Адась стараўся не адставаць ад іх: ён сам выкручваў і выпальваў лазовыя і сасновыя дудкі і падбіраў на іх пачутыя ў сям'і мелодыі. Менавіта таму ў 1925 годзе ён стаў студэнтам першага ў гісторыі Беларусі Мінскага музычнага тэхнікума, які скончыў у 1930 годзе па класу валторны. Затым вучоба ў Ленінградскай кансерваторыі. У 1932-1949 гг. — саліст аркестра Ленінградскага Малога獨 опернага тэатра (у час Вялікай Айчыннай вайны разам з тэатрам быў эвакуіраваны ў Арэнбург).

У 1949 Беларуская дзяржаўная філармонія запрасіла Адама Русака салістам сімфанічнага аркестра. Тады і адбылося яго непасрэднае знаёмства, а потым і сяброўства з кіраўніком народнага хору, народным артыстам Беларусі і СССР Генадзем Цітовічам. Яны часта разам былі ў вандроўках па Беларусі, збіралі багата фальклорных твораў.

У творчасці Адама Русака гарманічна спалучаецца паэзія і музыка. Першы друкаваны верш «Мая песня», з'явіўся ў 1927 годзе ў часопісе «Чырвоны сейбіт».

Аўтар зборнікаў: «На родных палетках» (1946), «Песні і вершы» (1951), «Песні» (1954), «Пад голас баяна» (1957), «Звонкія крыніцы» (1965), «Закрасуйся, Нёман» (1978), «Песні на словы А. Русака» (1980), «Засцілайце сталы» (выбранае, 1984) і інш. Для дзяцей выдаў кнігі вершаў «У Буслаўцы» (1967), «Добра ведаю ўрок» (1981), «Дружбакі» (1987). Вершы паэта вызначаюцца напеўнасцю, задушэўным лірызмам, мяккім народным гумарам, лёгка кладуцца на музыку.

Шырокую папулярнасць набылі песні на словы паэта, створаныя ў садружнасці са многімі кампазітарамі (каля 300): «Лясная песня» (сапраўдны гімн беларускім партызанам), «Толькі з табою», «Не шукай», «Не за вочы чорныя», «Узнялося сонца яснае», «Дзе ты, зорка мая», «Як той Зосі давялолся» і інш.

Але найбольшую вядомасць атрымала песня на словы Адама Русака «Бывайце здаровы» (музыка У. Захарава і І. Любана). Яна стала сапраўды народнаю і з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай песеннага мастацтва Беларусі.

# Літаратурная старонка

**Калейдаскоп**
**май 2024**

## ЧАС СТАЛАСЦІ

**Ужо апошні скончыўся ўрок,
Жыццё другое будзе пачынацца,
Наш развітальны празвінеў званок:
«Да пабачэння, любае юнацтва!»**

**Наперадзе жыцця вялікі шлях,
Суровае выпрабаванне долі,
Расчуленасці слёзы ў вачах,
Час развітання не забыць ніколі.**

**Нам па сямнаццаць, светлая пара,
Калі амаль адно дабро вядома,
Калі ў вачах агеньчыкі гараць,
У душу яшчэ не завітвла стома.**

**Час сталасці – цудоўны ўзнёслы дар,
Калі жыве на шчасце спадзяванне,
Час летуценняў і чароўных мар,
Час расквіту сапраўднага кахання.**

**Пайшлі ў нябыт юнацкія гады,
У сталасці што доля нам гатуе?
Мы школу пакідаем назаўжды,
Цяпер хто ад памылак нас уратуе?**

**Анатолій Баруценка**



# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**май 2024**

Без хлеба яда — да парога хада.
Як зварыш, так і з'ясі.
Чалавек галодны ні на што не годны.
Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе.
Дзе каша і аладка, там будзе і абрадка.
Як клёцкі ў малаку, то я па дзве валаку,
А як у водзе, то раз, два — і годзе.
Хлеб у доме — гаспадар, на працы — друг, у дарозе — таварыш.
Будзе час, будзе і квас, не ўсё за раз.



**Рэдкалегія: Кудраўцаў А.(9б),
Крупянкова А.(9б),
Фруцкая А.(9б),
Шаўцоў Д.(9б)
Рэдактар Юрчанка С.А.**